
КРЫВІНКА

ЛІСТАПАД
№17 (243)
2019 год

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА



МЕРКАВАННЕ РЭДАКТАРА

ВЫБАРЫ ЯК ПАКАЗЬНІК НАШАЙ АБЫЯКАВАСЬЦІ

У Бешанковіцкім раёне, які ўваходзіў у Лепельскую выбарчую акругу № 23, у выбарчых бюлетэнях было 7 кандыдатаў у дэпутаты. Вядома, што перамог тут Ігар Мартынаў, які ўжо 3,5 гады да гэтага адсядзеў у беларускім парламенце. Паспрабуем зразумець феномен гэтага выпадку.

Я буду рабіць свае высновы на лічбах Будзілаўскага выбарчага ўчастка № 7, які знаходзіўся ў Каранеўскай школе, і чые лічбы мне вядомыя.

З 288 выбарцаў, якія прагаласавалі тут, за Мартынава свае галасы аддалі 204 чалавекі — роўненька 70% электарату.

Сказаць, што Мартынаў за гады дэпутатцтва штосьці зрабіў выдатнае для Бешанковіцкага раёна, аніяк не атрымаецца. Не зрабіў. Сказаць, што ён не вылазіў з раёна перад выбарамі, сустракаўся з людзьмі, агітаваў за сябе — не, не і не. Сказаць, што ён геніяльны прамоўца і меў выдатную перадвыбарчую праграму і каманду — таксама не выходзіць. Тады чаму ён перамог? Адказ можа быць адзін: толькі таму што за яго галасавалі тыя, каму было ўсё роўна, за каго галасаваць.

Амаль усе, хто галасаваў за Мартынава, рабіў свой выбар не па ўнутранняму перакананню, не таму, што ён прааналізаваў усіх кандыдатаў і зрабіў свой выбар, а па нейкіх знешніх прычынах.

Адных прагаласаваць папрасілі начальнікі, і сказалі за каго канкрэтна (работнікаў фермы, трактарыстаў і г.д.) Другім, якія не мелі сваёй думкі, сказалі першыя. На вёсцы інфармацыя распаўсюджваецца менавіта так. У вёсцы ўсе аднавяскоўцы ведаюць адзін другога і ведаюць, як трэба «правільна» прагаласаваць. Вось прыкладны дыялог, які мая суседка-пенсіянерка вядзе штовыбары з сваёй суседкай-пенсіянеркай:

—Люба, ты пойдзеш сёньня галасаваць? — Пайду. —А за каго? — Яшчэ не ведаю. — Мар'я (якая працуе ў сельсавеце) казала, што трэба за Мартынава. — Добра.

Амаль усе тыя 204 чалавекі, хто прагаласаваў за Мартынава, галасавалі датэрмінова (158 чалавек), або па месцы пражывання, куды да іх прывезлі ўрны (76 чалавек). І калі б у іх была свая воля, яны на аніякія выбары не пайшлі б.

І вось цяпер уявіце тыя выбары без адміністрацыйнага рэсурсу. Калі дырэктар ці брыгадзір не цісне на сваіх падначаленых, яны самі не пойдуць на выбары. Гэта ім не патрэбна. Бо іх галава баліць ад іншых праблем, галоўная з якіх: дзе зарабіць лішнюю капейчыну, а не займацца, прабачце, нейкай фігнёй. На выбары пайдзе не 90% выбарцаў, а толькі 40 —45%, якія будуць галасаваць не так як ім скажуць, а так як яны думаюць самі.

Але ж, на выбары заганяюць, і, каб не мець непрыемнасцяў, людзі галасуюць так, «як трэба». Што з гэтага выходзіць? Выходзіць тое, што нейкі выпадковы чалавек, які не мае ні свайго палітычнага твару, ні сваёй адметнай пазіцыі, ні каранёў на нашай зямлі, ні харызмы будзе ў чарговы раз прадстаўляць інтарэсы нашага раёна ў парламенце. А выдатныя асобы, такія як Ягор Левачоў ці Андрэй Буйлоў, ураджэнцы нашага раёна, людзі маладыя і амбітныя, у якіх душа баліць за народ, аказаліся па-за гульнёй.

Дарэчы, гэта «баба Мар'я» з сельсавету — зусім не міфічная асоба. Менавіта работнікі сельсавета робяць усё магчымае і немагчымае, каб людзі ў вёсках галасавалі «правільна».

Вось жывы прыклад. На пазамінулых выбарах, калі балатаваўся я сам, мне распавядалі дакладныя факты пра тое, які ціск аказваўся на тых, хто ішоў на ўчастак у дзень выбараў галасаваць за мяне.

«А за каго ты будзеш галасаваць? За гэтага? А паглядзі вось, сёння ўсе галасуюць за гэтага...»

Г.Станкевіч

****

Я праз восень плыву,
і яна мне ўсьміхаецца ветла,
кажа штось наўздагон
і махае прыветна рукой.
Галасок далікатны яе
і такі непрыкметны,
нібы сон быльнягу,
што на ўзьмежку вартуе спакой.

Ён глядзіцца ўсю ноч
на высокія сонныя зоры,
што гайдаюцца зьлёгку
на восеньскім ветры ўгары.
Ім халодна ўначы,
адзінока ў бяскрайніх прасторах.
Дзесьці там і мая
сярод тых мірыядаў гарыць.

Адзінока і мне
сярод стомленых зор на дасьвецьці.
Пад іх позіркам пільным
прыходзіць суладзьдзе з сабой.
Прачынаецца дзень,
засынае няўрымсьлівы вецер,
пакрысе на зямлі
нараджаецца стомлены боль.

Каб прагнаць яго прэч,
усьміхаюся небу і зорам,
зноў і зноў у душы
пешчу думак сваіх сумятню.
І пяшчотнай смугой
абдымаюць за плечы прасторы,
у якіх цалкам зьнікну,
а потым раптоўна прысьню.

Г.Станкевіч

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

УСЕ П'ЮЦЬ, НЯМА КАМУ ДАІЦЬ КАРОЎ

На фермах Віцебскай вобласці няма каму даіць кароў. Віцебскі аблвыканкам разаслаў кіраўнікам сельгаспрадпрыемстваў загад: замяняць даярак, якія не выйшлі на працу, іншымі супрацоўнікамі — бухгалтарамі і ўсімі, хто ўмее. Здавалася б, смешна, аднак на справе ў калгасах Віцебшчыны катастрафічная сітуацыя. У каментарыі Еўрарадыё віцебскі чыноўнік не стрымаўся і расказаў праўду-матку пра сітуацыю ў сельскай мясцовасці.

"Каб не дапусціць спаду вытворчасці малака, у выпадку нявыхаду аператараў машыннага даення (далей — аператар) на працу ў тэрміновым парадку прымайце меры па замацаванні загадам па сельскагаспадарчай арганізацыі працаўнікоў гаспадарак (бухгалтэрыя і іншыя) для замены аператараў, якіх няма", — паведамляецца ў дакуменце, які апублікаваў блогер Nexta.

Атрымліваецца, што заатэхнік ці эканаміст прадпрыемства на ўсялякі выпадак мусіць умець даіць кароў?

"Працуюць разумова адсталыя, алкаголікі"

Мы звязаліся з першым намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, які падпісаў загад. Уладзімір Машэра ў размове з Еўрарадыё амаль адразу зрываецца. Відавочна, што сітуацыя з даяркамі ўжо сядзіць у яго ў пячонках:

"Няма каму даіць кароў! — эмацыйна ўсклікае абласны чыноўнік. — Каб падабралі работнікаў замест даярак, якія п'юць... У нас сапраўды не хапае даярак. Працуюць разумова адсталыя, алкаголікі! Часта каровы не дояцца, таму напісалі рэкамендацыйны ліст: калі даяркі зап'юць, каб выйшлі іншыя людзі і падаілі кароў".

"Кароў даіць — гэта не касмічны карабель запускаць!"

Чыноўнік гаворыць, што даяркі працуюць да першай зарплаты, а потым сыходзяць у запой і не прыходзяць на ферму. Даходзіла да таго, што кароў не даілі суткамі.

"Вы прыязджайце ў калгас, паглядзіце, што адбываецца! — абураецца віцебскі чыноўнік. — У калгасе працуе 150 чалавек, але ніхто не хоча ісці на ферму працаваць".

Уладзімір Машэра тлумачыць, што абласныя ўлады напісалі гэты ліст, каб у калгасах навялі парадак: "Трэба замацаваць людзей, каб кароў не губілі. Заробкі трэба плаціць, а зімой адзіная крыніца — гэта малако".

Ён кажа, што ў калгасах з усіх супрацоўнікаў хоць нехта, але ўмее карыстацца даільным апаратам: "Гэта не касмічны карабель запускаць! Калі карову не даіць, яна запускаецца: малако перагарае і карова ператвараецца ў быка. А даярка дома зачынілася і п'е. Прапіла ўсе грошы — вяртаецца і доіць далей".

"Кожны дзень да гэтых баб ходзяць новыя мужыкі. Да ночы п'янства, музыка!"

З праблем у сельскай гаспадарцы Уладзімір Машэра пераходзіць да праблем краіны. Відаць, што чалавеку набалела.

"Кожны год у Беларусі знікае раённы цэнтр. Пагледзіце, як будуюць жыллё ў горадзе! А хто туды едзе? Уладкоўваецца прыбіральшчыцай, нараджае трох дзяцей ад розных людзей — ёй ільготны крэдыт, — кажа чыноўнік. — У Шуміліне ўявлі гатовы дом. Людзі там стаялі на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Яна маць-гераіня — трое дзяцей. Дык там кожны дзень галівуд! Кожны дзень да гэтых баб ходзяць новыя мужыкі. Да ночы п'янства, музыка! Народ гуляе".

Што збіраюцца рабіць з даяркамі віцебскія ўлады? Пакуль канкрэтнага плана вырашэння праблемы няма. Каб каровы на фермах вобласці былі падоеныя, з горада збіраюцца вазіць часовых работнікаў.

Еўрарадыё

НАША ЖЫЦЦЁ

У ТАЛАЧЫНЕ ПАБУДУЮЦЬ БАСЕЙН…

Пакуль праект талачынскага басейна знаходзіцца на стадыі планавання: рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя, абмяркоўваецца месца размяшчэння ФАКа, вызначаюцца крыніцы фінансавання, асноўным з якіх стане мясцовы бюджэт. У Талачыне плануецца, што гэта будзе тыпавы ФАК, спраектаваны па аналогіі з аб'ектамі ў Верхнядзвінску і Браславе. Рэалізаваць праект маюць намер у бліжэйшыя тры гады. Хай ім Божа дапамагае...

Пакуль праект талачынскага басейна знаходзіцца на стадыі планавання: рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя, абмяркоўваецца месца размяшчэння ФАКа, вызначаюцца крыніцы фінансавання, асноўным з якіх стане мясцовы бюджэт. У Талачыне плануецца, што гэта будзе тыпавы ФАК, спраектаваны па аналогіі з аб'ектамі ў Верхнядзвінску і Браславе. Рэалізаваць праект маюць намер у бліжэйшыя тры

(працяг на стар. 2)

НАША ЖЫЦЦЁ

(пачатак на стар. №1)

гады. Хай ім Божа дапамагае...

Бешанковіцкі раён мае вялікі досьвед у будаўніцтве басейнаў. Можам дапамагчы талачынцам. У нас і месца размяшчэння вызначана, і дакументацыя гатовая...

Пра тое, што ў Бешанковічах пабудуюць басейн, упершыню абвесціў тагачасны старшыня райвыканкама Леанід Пяньkoўскі яшчэ ў верасні 2011-га года пры адкрыцці абноўленага раённага Дома культуры.

Тады ж гэту інфармацыю падхапіла і дзяржпрэса. Да прыкладу, газета «Віцебскі рабочы» тады ж напісала: «Новы аб'ект будзе садзейнічаць умацаванню здароўя жыхароў раёна, а таксама дазволіць ім з карысцю праводзіць свой вольны час. Вельмі хутка басейн запраектуюць, і ўжо ў 2012-м за справу возьмуцца будаўнікі, паведаміў дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксей Мацюшка, які выступаў перад жыхарамі райцэнтра. З яго словаў, фінансаванне работ будзе ажыццяўляцца з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Увесці аб'ект у эксплуатацыю плануецца ў 2013-м годзе.»

Цікава, дзе цяпер працуе народны дэпутат Мацюшка? Цалкам магчыма, што ў Талачынскім раёне. А яшчэ магчыма, што ён там балатуецца ў Народныя дэпутаты. Месца вельмі добрае, каб дапамагаць народу...

Праўда, у нас ёсць і свой новы Народны дэпутат — Ігар Мартынаў. Ён адбыў на гэтай ганаровай пасадзе чарговы тэрмін - 3,5 гады і цяпер перамог зноў. І хаця акрамя яго на гэту пасаду прэтэндавала яшчэ 6 кандыдатаў, у тым, што дэпутатам выберуць менавіта Ігара Феліксавіча, у мяне асабіста не было аніякага сумневу.

Дык вы пытаецеся,што з нашым басейнам? Адказваю: аніхто будаваць яго не зьбіраецца. А таму будзем, як і раней, купацца ў бальнічных сажалках, а ўзімку мыцца ў сваіх лазьнях. А каму дужа закарціць паплаваць і ў яго хопіць сродкаў, той няхай едзе ў шумілінскі, вушацкі і віцебскія басейны...

Г.Станкевіч

ЭКАНОМІКА

ЗАРОБКІ РАСТУЦЬ

У Бешанковіцкім раёне сярэдні заробак працягвае расьці. У верасьні ён склаў 797,4 рубля.

Але калі ў цэлым па краіне ён складае крыху больш за 1100 рублёў, то ў Бешанковіцкім раёне ён не дацягнуў і да 800 рублёў. І хаця ў будучыні ўлады абяцаюць ўзяцца за «адсталыя» раёны, Бешанковіцкага «перадавога» сярод іх няма. За верасень па краіне сярэдні заробак знізіўся. Знізіўся ён і ў 74 раёнах Беларусі з 118.

Бешанковіцкі ж раён жа пакрысе ўзьнімаецца па лесьвіцы адстаючых. Калі ў траўні ён займаў 18-е месца "знізу", то ў верасьні ўжо ўзьняўся на 23-е месца. То-бок раён займае цяпер 96-е месца сярод 118 раёнаў рэспублікі.

Калі ў лютым сярэдні заробак у Бешанковіцкім раёне складаў 624 рублі, то зараз ён складае 797 рублёў. (+173 рублі!)

У Віцебскай вобласьці мы займаем 9-е месца "знізу" пасля Шаркаўшчынскага (701,7), Мёрскага (721,1), Вушацкага (755,3), Гарадоцкага (766,2), Шумілінскага (779,7), Браслаўскага (788,6), Сенненскага (793,8) і Расонскага (795,3) раёнаў.

Але ж у нашых суседзей лепельцаў сярэдні заробак у верасьні склаў 855,8 рубля, у Чашніцкім раёне аж 943,2.

Найвышэйшы заробак па краіне каторы месяц у Салігорскага раёна. І хаця ён знізіўся за месяц на 352,6 рубля, усё роўна складае 1526,5.

У горадзе Віцебску сярэдні заробак атрымаўся 1000, 2 рубля.

М.Васільеў

ПАЗІЦЫЯ

ЧАМУ Я НЕ ГАЛАСУЮ

Апошнія выбары, на якіх я галасаваў, былі выбарамі прэзідэнта ў 2006-м годзе. Тады мне было крыху болей за 40, і я наіўна лічыў, што ўдзелам у галасаванні ў такім неабходным палітычным мерапрыемстве я набліжаю перамогу дабра над злом. Пасьля таго я шмат разоў быў назіральнікам на прэзідэнцкіх выбарах, вылучаў сваю кандыдатуру на выбарах самых розных узроўняў, але сам на іх больш не галасаваў. Чаму? Бо лічу тое бессэнсоўным.

Калі я збіраў подпісы, патрэбныя для рэгістрацыі, размаўляў з людзьмі, то бачыў, як да мяне тыя людзі адносяцца. Я дакладна ведаў, што найменш адна трэць выбарцаў за мяне прагаласуе. А потым аказвалася, што тая камісія, якая сабралася, каб палічыць мае галасы, не налічвала амаль анічога - прыкладна 2 -3 адсоткі (працэнты) ад усіх, хто прагаласаваў.

І я пачаў аналізаваць склад тых камісій. У нашым Бешанковіцкім раёне ён не на шмат адрозніваецца ад складу ў іншых рэгіёнах Беларусі. Як правіла, касцяк камісіі з году ў год утвараюць чыноўнікі і чыноўнічкі ўсіх масьцей і рангаў. Абсалютную іх большасьць(праўда, ёсьць і выключэньні з правіла), прыручаных і абласканых райвыканкамам, заахвочаных высокімі заробкамі і прэміямі, штовыбары зноў і зноў уключаюць у выбарчыя камісіі. Старшынём камісіі зноў-такі прызначаецца чыноўнік, які мае вельмі добрую пасаду. І калі ён страціць тую пасаду, па сутнасьці ён страціць залатую кармушку, без якой хоць складвай лапкі і памірай. А ісьці працаваць на простую работу яму вельмі ўжо ня хочацца, як кажуць у народзе, ён лепш павесіцца.

А таму той чыноўнік абавязаны перад райвыканкамам (выканаўчай прэзідэнцкай уладай) памерці, а забяспечыць патрэбныя вынікі выбараў. Праўда, памірацьім яшчэ не даводзілася. А вось патрэбныя працэнты на галасаванні яны малююць без натугі, даўно страціўшы і сорам, і сумленне.

Як тое адбываецца, я распавяду падрабязней.

Калі выгружаюць бюлетэні на стол для падліку, то члены камісій яго шчыльненька з усіх бакоў абступаюць. І "падлік" галасоў пачынаецца. Не, галасы на выбарах на самой справе лічацца. І не толькі лічацца – кожны ўдзельнік падліку перадае старшыні камісіі колькасьць галасоў, якія ён палічыў. І вось тут пачынаецца галоўнае: старшыня камісіі, якога аніхто не кантралюе, вольны рабіць тое, што ён хоча. У яго ў кішэні ёсць даўно даведзеныя лічбы, якія ён мусіць агучыць перад усімі членамі і назіральнікамі. І ён іх агучвае. Тое, што тыя лічбы далёкія ад рэальных, яго абсалютна не турбуе. Ён добра ведае: даказаць ягоны падман амаль немагчыма, бо пасьля галасаваньня ўсе бюлетэні чамусьці хуценька знішчаюцца.

Праўда, магчымы і іншы варыянт развіцця падзей. Напрыклад, на нейкім участку ў дзень выбараў абсалютная колькасьць людзей (да 95 %) галасуе не за патрэбнага ўладзе чалавека, а за іншага. Што рабіць? Людзі ж могуць дамовіцца, сабрацца і апратэставаць вынікі падліку і будзе вялікі скандал. Каб забяспечыць бясьпеку ад такога развіцця падзей, дзейсная бязьзьменная ўлада і прыдумала так званае датэрміновае галасаванне. То-бок, трэба забяспечыць перамогу патрэбнаму кандыдату загадзя, каб дзень галасаваньня ўжо нічога не вырашаў. Бо галасы датэрмінова прагаласаваўшых лёгка падмяняюцца патрэбнымі бюлетэнямі.

У цывілізаваных краінах у датэрміновым галасаваньні ўдзельнічае не больш за 3-5% выбарцаў. У Беларусі - да 50%.

У цывілізаваных краінах у дзень выбараў пры падліку галасоў са стала бярэцца бюлетэнь, называецца за каго ён і паказваецца ўсім назіральнікам. І любы прысутны напрыканцы падліку ведае, хто фактычна перамог на гэтым участку.

Здаецца, цяпер Вам павінна быць зразумела, каму мы мусім быць удзячнымі за тое, што наша жыццё не зьмяняецца. А калі і зьмяняецца, то чамусьці ня ў лепшы бок.

Грамадзяне, усе - на выбары!

Г.Станкевіч

ТРАГЕДЫЯ

ГРАНДЫЁЗНЫЯ ПЛАНЫ "БЕЛВЕСТУ"

Перад калектывам СТАА «Белвест», чыё падраздзяленне ўжо некалькі гадоў функцыянуе ў Бешанковічах, стаіць амбіцыйная задача: да 2023 года павялічыць аб'ёмы вытворчасці абутку амаль удвая - давесці да трох мільёнаў пар у год.

- Наша прадпрыемства з'яўляецца адным з чатырох найбуйнейшых вытворцаў абутку ў паўночнай сталіцы, якую яшчэ называюць абутковай, - падкрэсліў намеснік генеральнага дырэктара СТАА «Белвест» Міхаіл Шатуноў. - Сёння мы выпускаем звыш 1 млн 700 тыс. пар абутку, якія сыходзяць з канвеера. Належыць здзейсніць значны рывок наперад у рамках падпісанага кіраўніком дзяржавы ўказа аб стварэнні холдынгу «Белвест». Ці рэальныя задачы пастаўленыя перад намі? Цалкам. Для павелічэння аб'ёмаў вытворчасці маем фінансавыя магчымасці, вытворчыя магутнасці, неабходнае абсталяванне, але пытанне ўпіраецца ў дэфіцыт рабочых кадраў. Каб выйсці на запланаваныя паказчыкі, ужо ў бліжэйшы год трэба папоўніць калектыў як мінімум 150 абутнікамі і давесці агульную колькасць рабочых на прадпрыемстве да двух тысяч. А іх вельмі не хапае.

- Міхаіл Міхайлавіч, дазвольце запярэчыць. Ні ў адным рэгіёне няма столькі навучальных устаноў, як у Віцебску, якія рыхтуюць кадры для лёгкай прамысловасці. І пры гэтым дэфіцыт?

- Давайце разбярэмся, што нам прапануюць і што мы маем. Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж лёгкай прамысловасці сапраўды рыхтуе зборшчыкаў (швачак), раскройшчыкаў абутку пасля 9 - 11 класаў. Штогод выпускае каля 130 спецыялістаў, якія затрабаваны не толькі «Белвестам», але і яшчэ некалькімі буйнымі абутковымі прадпрыемствамі ў Віцебску. А калі ўлічыць, што навучэнцы каледжа атрымліваюць прафесію зборшчыка абутку - цырульніка і іншыя спараныя кваліфікацыі, не ўсе яны ідуць працаваць абутнікамі, то выснова напрошваецца сам сабой. Зауважу: гадоў дзесяць таму гэтая ўстанова адукацыі штогод рыхтавала 250 абутнікоў. Што тычыцца ВДТУ, дзе куюць высокакваліфікаваныя кадры для лёгкай прамысловасці, на наша прадпрыемства размяркоўваюцца каля пяці чалавек: больш не патрабуецца.

Дарэчы, не ад добрага жыцця даводзіцца здвойваць кваліфікацыі пры падрыхтоўцы кадраў, пракаментаваў дырэктар Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа лёгкай прамысловасці Вячаслаў Яроменка. Толькі б набраць жадаючых, хоць вельмі актыўна каледж праводзіць прафарыентацыйную працу.

- Што трэба зрабіць, каб вырашыць кадравую праблему ў абутковай галіне?

- Варта аргументавана арыентаваць школьнікаў на атрыманне рабочых прафесій, - адзначыў Міхаіл Шатуноў. - Пакуль жа і настаўнікі, і бацькі любымі спосабамі цягнуць дзіцяці ў ВНУ, нават калі балы ў атэстаце нізкія і ён сам гэтага не хоча. Вышэйшая ацэнка работы настаўніка і школы ў цэлым заключаецца ў тым, колькі выпускнікоў паступіла ў ВНУ. Пры такім раскладзе мы яшчэ доўга будзем адчуваць дэфіцыт рабочых кадраў, у тым ліку абутнікоў.

Некалькі гадоў таму на «Белвесьце» правялі маштабную акцыю па прыцягненні моладзі на прадпрыемства. Запрасілі кіраўніцтва профільнага каледжа, дырэктараў віцебскіх школ, а таксама саміх старшакласнікаў - пабывала больш за 600 хлопчыкаў і дзяўчынак, каб яны на свае вочы пагледзелі і азнаёміліся з умовамі працы. Кіраўніцтва расказала аб прэферэнцыях для тых, хто паступіць у каледж і прыйдзе працаваць на прадпрыемства, - гэта дадатковая стыпендыя, бясплатнае харчаванне для практыкантаў, зніжкі на набыццё абутку і іншае. Пасля тытанічнай працы па прафарыентацыі вучыцца ў каледжы выказалі жаданне ... восем чалавек.

- І як збіраецеся вырашаць кадравае пытанне?

- Каб пераламаць сітуацыю, трэба час. А яго ў нас няма. Таму самі рыхтуем абутнікоў. Набіраем усіх жадаючых, нікому не адмаўляем у працаўладкаванні і навучаем. Гаворка ідзе не толькі пра маладых і перспектыўных прэтэндэнтаў. У перыяд навучання ў першы месяц плацім вучням мінімальную зарплату (350 руб.), у другі і трэці - вучнёўскія (200 руб.)

Зза шкодныя ўмовы, працу ў начны час, падвойная аплата ў выхадныя і святочныя дні, матэрыяльная дапамога да адпачынку, юбілеяў, з нагоды нараджэння дзіцяці і заключэння шлюбу і іншыя бонусы.

- Рабочыя ў нас - прывілеяванае саслоўе, робім усё, каб падняць прэстыж абутніка, - падкрэсліў напрыканцы размовы Міхаіл Шатуноў.

Алена Башун
Вітвесці

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

«МАШТАБ ТАГО, ШТО АДБЫЛОСЯ Ў ВІЛЬНІ, ШАКАВАЎ УСІХ»

Маштаб, з якім патрыёты Беларусі праз візавы кардон і працоўны графік прарваліся ў Вільню, каб ушанаваць Кастуся Каліноўскага, бацьку нацыі, — маштаб гэты шакаваў усіх. Летувіска сярэдняга веку, побач з якой мы з сябрамі сядзелі ў кавярні, на ламанай расейскай так прачулена распавяла нам, у якім яны захапленні ад беларусаў, аж прасякнуліся 22 лістапада духам свабоды пачатку 90-ых.



Можна колькі заўгодна спрачацца пра спадчыну Паўстання, але гэтыя дні яскрава выявілі, дзеля чаго перадусім жыў і за каго перадусім змагаўся Кастусь Каліноўскі. Можна колькі заўгодна выразаць з эфіру бел-чырвона-белыя сцягі, але ўваскрэслыя з-пад вапны героі пераконваюць нас: праўда перамагае нават тады, калі ейных носьбітаў спыняюць фізічна.

Зласлівцы Беларусі спрабуюць даказаць, што Каліноўскі паляк і паўстанне чыста польскае, хоць сам Яська гаспадар з-пад Вільні ад самага пачатку пісаў: «Ад маскаля і паноў няма чаго спадзявацiся, бо яны не вольнасці, а глуму і здзерства нашага хочуць» (Мужыцкая праўда, 1:16). Зласлівцы Каліноўскага спрабуюць даказаць, што Каліноўскі пераследаваў праваслаўных, хоць за падтрымку паўстання самі расейцы рэпрэсавалі 14 праваслаўных святароў. Ворагі Беларусі скрыгочуць, што Паўстанне было бяссэнсоўным, але ж на мапе свету няма сёння турмы народаў, але ёсць незалежныя Польшча, Летува, Беларусь, за свабоду якіх і змагаліся паўстанцы 1863—1864 гадоў.

Уявіць, што расступіцца зямля і героі Паўстання ўваскрэснуць з-пад вапны, не мог нават самы смелы патрыёт. Але Бог гэта зрабіў. І зрабіў не абы калі, а менавіта цяпер, калі на 30-ым годзе незалежнасці мы зноў разважаем пра страту незалежнасці. Зрабіў менавіта ў гэтыя дні, калі на 20-ым годзе будавання «Саюзнай дзяржавы» адміністрацыя зноў прэцца ў імперыю дзеля новай дамовы на рабства. Тое, што Каліноўскі недарабіў на зямлі ў цэле, ён робіць сёння па-за целам. І разважаць над гэтай містэрыяй было б добра сёння кожнаму патрыёту. Каб упэўніцца ў сабе, каб умацавацца вераю, што Госпад не кідае нас нават у сённяшнім нашым расцярушанні.

Творца гісторыі ўваскрасіў нас з-пад вапны турмы народаў, уваскрасіў з-пад вапны імперыі зла, Ён уваскрасіць нас і з-пад вапны часовай акупацыйнай адміністрацыі.

Зміцер Дашкевіч
"Наша Ніва"
Ад рэдакцыі.
Тут ўсё: www.svaboda.org/a/30287197.html

ПАМЯЦЬ

«НЕ ИХ ГЕРОЙ»

На горе Гедемина в Вильнюсе расступилась земля, чтобы хотя бы через 155 лет были отданы почести и дань памяти тем, кто жизнь положил за «белорусскую идею».

Похоронили лидеров антироссийского восстания.

Похоронили романтиков.

Похоронили героев.

Но давайте понимать и то, что вчера хоронили людей, которые выступали за иной цивилизационный выбор для Беларуси.

«Не народ для ўрада, а ўрад для народа» — это не просто красивая цитата из Кастуся Калиновского. Это не просто лозунг. Не просто идея.

Тома исследований написаны на тему ментальных отличий Востока и Запада. Научно, аргументированно, подробно. Но если тезисно, то главные отличия таковы.

Запад — государство для человека. Восток — человек для государства.

Запад — стремление к постоянному обновлению, преобразованию жизни. Восток — созерцательность, медленное, плавное развитие, сохранение старого, приспособление к новому.

Западная цивилизация ориентирована на понятие отдельной личности; каждый человек существует как личность, а не как винтик в массе людей. Восточная цивилизация ориентирована на понятие массы людей, и человек обязан сознавать себя частицей этой массы.

Таким образом, получается, что географически Беларусь находится в Европе, но по духу, по содержанию, по ценностям мы сегодня не европейское государство. 155 лет назад Российская империя на штыках навязала нам этот цивилизационный выбор — восточную азиатчину. И, собственно, именно против этого слома культурного кода белорусов было восстание Кастуся Калиновского.

Александр Лукашенко не поехал в Вильнюс на перезахоронение останков повстанцев. Министерство обороны Беларуси отказалось прислать почетный караул. Логично. Потому что главному баю Беларуси и его байству крайне удобно править бесправной серой массой. Именно такой народ для них — важное приобретение и ценность. Калиновский не их герой. Они могли только скрежетать зубами на его похоронах.

Но для белорусов, которые видят себя европейцами, Кастусь Калиновский — герой. Мы должны вернуться в Европу. Для Беларуси это и логично, и правильно. А, значит, лозунг Калиновского «Не народ для ўрада, а ўрад для народа» — это даже не белорусская мечта, это наша цель.

https://gazetaby.com

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ДОЛАРЫ ЯК ФАКТАР БЕЛАРУСКАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

«Нельга не прызнаць справядлівасць ісціны аб тым, што маленькія заробкі здольныя разбурыць нават самую моцную дзяржаву». Залатыя словы, пагадзіцеся. Прамоўленыя яны былі адзіным палітыкам (АП) 18 траўня 2001 года з трыбуны другога Усебеларускага народнага сходу і сваёй актуальнасці да гэтага часу не страцілі.



У верасні 2019 года сярэднестатыстычны беларус зарабіў 1108,5 рубля, што эквівалентна 538 доларам, ці 484 еўра. У параўнанні з заробкам сярэднестатыстычнага паляка, які атрымлівае каля 900 еўра, такія заробкі варта прызнаць маленькімі. Чым гэта пагражае моцным дзяржавам, сказана вышэй. Але ці можна лічыць такой Рэспубліку Беларусь, што прэтэндуе на званне донара еўрапейскай стабільнасці?

Адназначнага адказу на гэтае пытанне ў мяне няма, але вернемся да прамовы 18 траўня 2001 года: «Мы па крупінках збіралі дзяржаву і разбураную краіну. Калі пасля развалу СССР мы засталіся "без штаноў", дык спрабавалі іх пашыць ледзь не кожнаму, ды яшчэ змагаліся з "пятай" калонай унутры і дабрадзеямі звонку»…

Няма сёння праблемаў і са знешнімі «дабрадзеямі» на Захадзе. Што можам — прадаём. На што хапае сродкаў — купляем. Нaконт спрашчэння візавага рэжыму амаль дамовіліся. Прыгажосць! Вось толькі на Усходзе не ўсё так складваецца, як хацелася б. Але мілыя сварацца, толькі цешацца. Дзвюм галінам аднаго народа высвятляць адносіны — справа звыклая.

Аднак адсутнасць «пятай» калоны не адмяніла фантомных боляў, якія засталіся ў спадчыну ад «ліхіх 90-х». Адсюль нявызначанасць з выбарамі — яны ці то свята, ці то «вакханалія». Магчыма, мы маем справу са святам электаральнай вакханаліі. Такое вось «два ў адным» з нацыянальным каларытам.

Словы «сіла» і «стабільнасць» не з'яўляюцца сінонімамі. Стабільнасць могілак сілы жывым не дадае. Не дадае стабільнасці і наяўнасць практычна ў кожнага беларуса штаноў. Дзяржава абяцала «іх пашыць ледзь не кожнаму» — і сваё абяцанне яна выканала. Ды што там штаны. Беларусам даўно ўжо не сорамна адзначаць Дзень аўтамабіліста і дарожніка. У гэтым годзе ён прыпаў на 27 кастрычніка. Звернемся да афіцыйнай статыстыкі: колькасць легкавых аўтамабіляў у асабістай уласнасці грамадзян у 2018 года склала 3031 тысячу (2972,7 тысячы ў 2017 годзе), што дазволіла давесці забеспячэнне легкавымі аўтамабілямі на 1000 чалавек насельніцтва да 320 штук.

У 2018 годзе Беларусь імпартавала 86,9 тысячы легкавых аўтамабіляў (158,3% да 2017 года). Свет у цэлым скараціў куплю «жалезных коней» на 4%. Свет скараціў, а беларусы павялічылі, прычым павялічылі на непрыстойны працэнт для краіны, што выпрошвае крэдыты для рэфінансавання ранейшых крэдытаў. Якіх толькі парадоксаў жыццё не падкіне, калі на коне шосты тэрмін! А без яго нам ніяк. Нас 9 454,8 тысячы, але максіма «Калі не ён, дык хто ж?» не губляе сваёй актуальнасці.

Задача пастаўленая, мэта вызначаная

…Рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек — дзе лепш. Таму маленькія заробкі і здольныя разбурыць нават самыя моцныя дзяржавы. Зразумела, калі сіла дзяржаваў і дабрабыт грамадзян ніяк паміж сабой не звязаныя. Прыгадаем сумны лёс СССР з яго парытэтам з ЗША па колькасці ядзерных боегаловак, але з адсутнасцю парытэту па туалетнай паперы на адзін сярэднестатыстычны азадак.

Можна колькі заўгодна ўдасканальваць «беларускую мадэль» з дапамогай прапаганды, але права галасаваць нагамі нікому яшчэ адмяніць не атрымалася. Нічога незвычайнага ў гэтым няма. Іміграцыя — з'ява старая, як свет. Мінула каля 70 тысяч гадоў з таго часу, як прадстаўнікі віду Homo sapiens пакінулі Афрыку і за кароткі паводле гістарычных мерак час засялілі ўсе кантыненты, акрамя Антарктыды.

Адпаведную сацыялогію ў інтэрнэце я не сустрэў, аднак упэўнены, што сярод першых перасяленцаў пераважалі маладыя і прадпрымальныя. Як гэта адбілася на эканамічным развіцці Афрыкі — здагадацца нескладана. Для гэтага дастаткова звярнуцца да беларускага досведу. Тут напрошваецца прамая аналогія.

Праблема адтоку кадраў упершыню была ўсвядомленая кіраўніцтвам краіны яшчэ ў 2008 годзе, што лёгка пацвердзіць цытатай з паслання АП за адпаведны год: «На канец пяцігодкі (2010 год. — Заўвага рэд.) нам трэба заробтную плату давесці, баюся казаць, але да 700 долараў, нікуды не падзенемся. 500 долараў

(працяг на стар. 4)

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

(пачатак на стар. №3)

будзе мала. Трэба 700 — сярэдні заробак па краіне. Тады мы зможам утрымаць стабільнасць у нашым грамадстве».

Задача па дасягненні 700 долараў нарадзілася не на пустым месцы. АП ішоў «ад жыцця» — ад жыцця ў Расіі, у якой, згодна з паведамленнямі Мінстата, у сакавіку 2008 года заработная плата склала 688 долараў.

Задача пастаўленая, мэта вызначаная. Ва ўрадзе пстрыкнулі абцасамі і ўзялі пад казырок. 20 траўня на пасяджэнні прэзідыума Саўміна намеснік міністра фінансаў Андрэй Харкавец запэўніў, што да канца 2009 года сярэдні заробак складзе 550, а да канца 2010 года — 700 долараў! Калі ўлічыць, што стартаваць даводзілася з адзнакі ў 390 "зялёных", то па ўзроўню аптымізму беларускі ўрад мог смела прэтэндаваць на траплянне ў «Кнігу рэкордаў Гінеса».

Вынік шчоўкання абцасамі вядомы: індэкс спажывецкіх цэнаў у апошні год пяцігодкі (снежань 2011 года да снежня 2010-га) склаў 208,7%, а беларускі рубель да долара патаннеў у тры разы.

Лекары ў медыцыне — не галоўнае

Заснавальнікі савецкай дзяржавы спрабавалі «дагнаць і перагнаць» заходні свет па вытворчасці чыгуну і сталі на душу насельніцтва — і мелі ў гэтым поспехі. Але гэты паказчык выйшаў з моды яшчэ пры дарагім Леаніду Іллічу Брэжневу. Як ні стараліся штатныя прапагандысты, але прытармазіць бесперапынны рост матэрыяльных і духоўных патрэбаў савецкага чалавека ім было не дадзена.

…Падчас размовы з журналістамі было згадана пра нядаўняе рашэнне Польшчы ўвесці новыя правілы для лекараў з-за межаў Еўрасаюза, якія адмяняюць, у прыватнасці, абавязковае пацверджанне дыпломаў. Адказ АП цытую паводле прэс-рэлізу: «Нас гэта хвалюе, але не напружвае. Міністр гаворыць, што на працягу двух гадоў наогул гэту праблему (недахопу ўрачоў у медустановах. — Заўвага рэд.) здымем. Таму, можа, і нічога страшнага, што чалавек паехаў, недзе чамусьці падвучыўся. Галоўнае, каб ён не забываў пра краіну, вяртаўся назад і дапамагаў ёй».

Лекарам АП паабяцаў да 2025 года падвойныя заробкі. Але лекары ў медыцыне — не галоўнае. Галоўнае — наяўнасць сучаснага абсталявання. «Трэба так зрабіць, каб наш лекар быў абсталяваны, як замежны», — падкрэсліў АП.

Зводзіць мадэрнізацыю да завозу новага абсталявання — гэта не ў Беларусі прыдумалі. Яшчэ пры цару Гароху было заўважана, што абсталяванне ніякіх патрабаванняў да якасці дзяржаўных інстытутаў не прад'яўляе. Абсталяванню глыбока абыякава, дапускаюць кандыдатаў ад апазіцыі да выбараў або здымаюць паводле надуманых прычынаў. Яно гатовае пакорліва гадамі стаяць у скрынях нераспакаваным, і пры гэтым ціхенька маральна састарэць.

З жывымі людзьмі складаней. Маўчаць (гадамі стаяць у скрынях нераспакаванымі) згаджаецца шмат хто, але далёка не ўсе. У гэтым і палягае галоўная праблема ўлады, якая ўзяла на сябе абавязак пашыць ледзь не кожнаму беларусу штаны.

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

ПАРАДЫ

ШТО РАБІЦЬ З ФАЛЬСЫФІКАТАРАМІ ВЫБАРАЎ

Што я чула ад калег, якія бралі ўдзел у працы «выбарчых» камісій, пра фальсыфікацыі? Чула такое: «Заўтра ў камісію. Нешта я баюся. Чаго баюся? Усяго. Ладна, няважна. Тыдзень патрываць». Чула такое яшчэ: «Мы царовы людзі. Нам дзяржава плаціць грошы. Мы служым дзяржаве, а не камусьці яшчэ». Чула і такое: «А нашто нам фальсыфікаваць? У нас усё па праўдзе».

Суровая праўда ў тым, што людзі, якія сядзяць там, у гэтых камісіях, ніколі не прызнаюцца ані вам, ані нават сабе, што яны фальсыфікуюць выбары. Яны робяць усё што заўгодна: выконваюць загад, трываюць, бароняць сваю ўладу, прасоўваюць свайго кандыдата, які паабяцаў школе ці прадпрыемству залатыя горы за перамогу (і ён выканае абяцаньні, не хвалюйцеся!) — яны робяць усё што заўгодна, але не фальсыфікуюць. Таму дагрукацца да іхнага сумленьня зусім немагчыма.

Сумны парадокс сытуацыі заключаецца ў тым, што ўва ўсіх іх ёсьць пэўнае сумленьне, і менавіта таму яны ведаюць, як і чым яго прывесьці ў норму. Яны ўсё сабе патлумачылі, і сумленьне іхнае ў парадку. Аргумэнты, якімі яны дазволілі сабе фальсыфікаваць што заўгодна, жалезныя, таму што выпрацаваныя для экстрэмальных сытуацый.

Вы не сустрэнеце там аніводнага чалавека, якога можна назваць прыстойным, на іх ня ўзьдзейнічаюць словы аб прыстойнасьці. За столькі гадоў існаваньня нашай псэўдавыбарчай сыстэмы сьпісы гэтых людзей шматкроць правераныя і загартаваныя ў баях. Любая заклікі да іх бессэнсоўныя, любыя высокія словы пра мараль і закон — пыл. І ня толькі падчас працы ў камісіях. Наогул.

З самага дзяцінства гэтыя людзі жывуць ва ўмовах, у якіх закон не вырашае нічога, а асабістыя сувязі і ўменьне прагінацца — усё. Менавіта грунтуючыся на сваім, падтрыманым жыцьцёвым досьведам пакаленьняў, разуменьні законаў і маралі, яны рабілі кар'еры, будавалі кватэры, вучылі дзяцей, здабывалі ўласны дабрабыт і спакой. Сустракаюцца сярод іх і настаўнікі, шараговыя — радзей за тых, хто абцяжараны пасадай, а значыць, дадатковым прэсам залежнасьцяў, страхаў і дазволаў на зло. Цяжка быць дырэктарам альбо завучам і не фальсыфікаваць што заўгодна кожны дзень з розных нагодаў. Проста таму, што так працуе сыстэма, і ня толькі выбарчая.

Мне пішуць: «Ганна, зьвярніцеся да настаўнікаў, каб яны не фальсыфікавалі выбары». Я ня маю такіх слоў, каб да іх зьвярнуцца з простым заклікам. Баюся, такіх заклікаў наогул не існуе. Паводле іхнага разуменьня, яны не фальсыфікуюць. Яны так выконваюць свой грамадзянскі абавязак, бароняць сваіх дзяцей і забясьпечваюць унукаў.

Гэта моцна нагадвае мне савецкіх сьледчых трыццатых гадоў. Ніхто зь іх не сказаў ніколі нікому, і найперш сабе: я катаваў падсьледных, таму што хацеў катаваць. Яны ўсе былі ўпэўненыя, што так, і толькі так можна выканаць свой абавязак. І чым страшней, чым брудней гэта рабілася, тым часьцей яны думалі пра сябе: які ж я непахісны герой, і на што толькі я не іду дзеля сваёй краіны. Гэта вам не ракеты ў космас запускаць. Ракеты любы дурань запусьціць. Ты от паспрабуй, як я, кожны дзень у крыві ды крыках. Гэта табе не чысьценькімі рукамі паперкі перакладаць. Тожа мне, беленькія. Дзе б вы былі, беленькія, каб мы чорненькімі не былі тут дзеля вас.

Я казала сваёй былой каляжанцы: «Дык калі вы баіцеся, чаго туды ідзяце? Столькі нэрваў за сьмешныя грошы. Адмоўцеся, ды ўсё». Яна мне адказвала: «Хіба я толькі гэтага баюся? Я і працаваць кожны дзень баюся. Мне што, ад усяго адмаўляцца?» Я тлумачыла другой: «Вам не дзяржава плаціць грошы, а людзі, падаткаплатнікі. Дзяржава вам ня цар, а слуга, і мы маем права патрабаваць ад яе справядлівасьці і сумленьня». Яна расьсмяялася. У трэцяй я не пыталася нічога, бо я ведаю, што ў маленькіх гарадах і вёсках сапраўды ня трэба нічога фальсыфікаваць. Усё адбываецца само.

Для чаго я гэта ўсё пішу. Для таго, каб мы зразумелі: у нас ня будзе іншых выбарчых камісій. Мы не дагрукаемся да іх чальцоў ніякімі словамі. Яны будуць стаяць насьмерць, баронячы свае пасады, свае выгоды, сваё спакойнае жыцьцё тут і цяпер. Асабліва калі яны будуць разумець, а яны ўжо гэта разумеюць, што за ўкіды бюлетэняў і прыпіскі давядзецца адказваць, калі яны раптам прызнаюцца, пакаюцца і перастануць супрацоўнічаць з уладай.

Што нам рабіць? Ведаць свайго ворага і ня мець надзей на тое, што ён зьнікне. Мацнець і пашырацца.

Спакойна, але няспынна рабіць сваю працу: выхоўваць свабодных і сумленных дзяцей, нічога і ніколі не фальсыфікаваць самім пад любым, нават самым сьвятым, соўсам, падымаць і пашыраць сваю мову, ведаць сваю гісторыю і культуру, адчуваць сябе гаспадаром сваёй зямлі, несьці гэта адчуваньне далей, перадаваць з рук у рукі, уключацца ў грамадзкі рух, не баяцца і не схіляць галавы. …

Безупынна, спакойна і цьвёрда, без залішніх патасных словаў і заклікаў да сумленьня і справядлівасьці, казаць сваім родным і знаёмым, якія бяруць у гэтым удзел: «Гэта фальсыфікацыі. Гэта нічым немагчыма патлумачыць. Ты парушаеш закон». Яны не паверыць, але яны будуць ведаць, што ня маюць падтрымкі.

Гэта надзвычай доўгі шлях. Іншага, на жаль, я ня ведаю.

Ганна Севярынец
"Радыё Свабода"

РЭХА

ВЫБАРАЎ НЯМА. АЛЕ ВЫБАР — ЁСЦЬ

На мінулым тыдні краіна перанесла хваробу, якая афіцыйна завецца выбарамі. І многія перажываюць пасля яе ўскладненні: кагосьці не адпускае галаўны боль і сусветнае расчараванне, у некага круціць пальцы ад падтасоўвання лічбаў у пратаколах, пячэ рукі ад укідаў бюлетэняў, а некага спальваюць згрызоты сумлення.

Як бы ні было, наступствы ад «вакханаліі» адчуваюць усе, хто прама ці ўскосна браў у ёй удзел. Так, некалькі назіральнікаў вымушаны былі звяртацца па медычную дапамогу наўпрост на выбарчых участках: у аднаго скокнуў ціск, у другой не вытрымалі нервы… З якімі праявамі «поствыбарчага сіндрому» сутыкнуліся чальцы камісій і галоўныя арганізатары гэтай ліхаманкі, сказаць цяжка, але і для іх яна не прайшла бясследна. Я асабіста ведаю чалавека, які быў сябрам камісіі, і пасля ўсяго, што адбылося, прызнаўся, што яму сорамна за ўдзел у гэтым.

Напачатку ён яшчэ спрабаваў апраўдвацца, што ў яго не было выбару — проста паставілі перад фактам. Яму не хацелася губляць працу ў сталым узросце, псаваць адносіны з кіраўніцтвам… Але, паслухайце, хіба пра адсутнасць выбару тут гаворка? Для мяне ў гэтай сітуацыі выбар яскраз відавочны — нежаданне супраціўляцца і змагацца за свае правы.

Хіба шмат знойдзецца злодзеяў, якія прызнаюцца, што рабілі злачынства дзеля самога злачынства? Часцей за ўсё злачынцы знаходзяць сабе апраўданне, спасылаюцца на абставіны… Хіба большасць даносаў на сяброў і суседзяў у 1930-х гадах пісалі проста дзеля таго, каб ім нашкодзіць? Не, даносчыкі хацелі адвесці бяду ад сябе. Ну і заадно завалодаць суседскім дабром — усё адно ж прападзе.

Канешне, мяне можна папракнуць у занадта жорсткіх параўнаннях. Але, па-першае, якая розніца, пад які артыкул Крымінальнага кодэкса трапляе злачынства? Яно ўсё адно застаецца злачынствам. Па-другое, ніхто не ў стане даць адказ, на што можа пайсці чалавек, прыціснуты страхам. Сёння ён фальсіфікуе выбары, а заўтра можа пайсці пісаць даносы.

Менавіта страх — тое пачуццё, якое ў нас узрошчвалі не адно пакаленне і ад якога мы так і не здолелі пазбавіцца, жывучы ў незалежнай краіне. Ад таго і «выбары», і шмат якія яшчэ працэсы ў нашай дзяржаве з году ў год адбываюцца па нязменным сцэнары. Страх згубіць нагрэтае месца і добры заробак прымушае людзей марнаваць жыццё на ненавісная працы. Страх застацца ў адзіноце прымушае жанчын цярпець хатні гвалт. Страх быць раструшчаным сістэмай прымушае моўчкі парушаць закон дзеля ўмацавання гэтай сістэмы. І самае непрыемнае, калі ўзнікае стакгольмскі сіндром, і ахвяры пачынаюць апраўдваць сваіх катаў.

Вось толькі парадокс у тым, што той, хто баіцца, прайграе пры любым раскладзе. Сістэма ўсё гэтак жа будзе падмінаць баязліўца пад сябе, гвалтаўнік усё гэтак жа будзе чыніць здзек з маўклівай ахвяры, працадаўца будзе пагарджаць працаўніком, які баіцца заявіць пра свае правы.

Бо навошта нешта мяняць, калі ўсіх усё задавальняе? Але, як пісаў Караткевіч, Бог даў беларусу дзюбу не для таго, каб ён пішчаў. І, пагатоў, галава дадзеная кожнаму з нас не толькі для таго, каб насіць капялюш і пры нагодзе хаваць яе ў пясок. А перадусім — каб думаць і рабіць выбар.

Бо нават калі ў краіне няма сапраўдных выбараў як формы ўдзелу грамадзян у грамадска-палітычным жыцці дзяржавы, кожны ў стане зрабіць выбар для сябе: баяцца ці не, казаць праўду ці маўчаць, удзельнічаць у злачынстве ці выкрываць яго, заставацца сумленным чалавекам ці пераходзіць на бок пануючага зла.

Ёсць усяго некалькі выпадкаў, калі можна казаць пра адсутнасць выбару: калі пазбаўлены розуму і дзеяздольнасці ці калі знаходзішся ў магіле. Але ж нас з вамі гэта не тычыцца?

Дзіяна Серадзюк
"Новы Час"

Заснавальнік і рэдактар: Станкевіч Георгій Мікалаевіч

Адрас рэдакцыі: Бешанковіцкі раён, в. Старыя Ранчыцы, e-mail: stan62@list.ru, тэл. 60237, маб. +375292184739
Газета выдаецца з сакавіка 2005г.

Падпісана да друку 30.11.2019 у 16.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на ўласным абсталяванні.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.